*Анастасія Скеп'ян*

# Спроба рэканструкцыі інтэр'ераў парадных пакояў у Мірскім замку

Музеефікацыя залаў і пакояў Мірскага замка звязана з пэўнымі цяжкасцямі, не апошнімі сярод якіх стала адсутнасць дакументальных матэрыялаў, што датычыліся ўнутраннага ўбрання палаца перыяду яго будаўніцтва пры кн. Мікалаі Радзівіле Сіротцы (1549–1616). Цяжкасці складае і тое, што аднаўленне (ці хутчэй гістарычная рэканструкцыя) інтэр'ераў будзе праводзіцца нават не ў тых памяшканнях, небагатыя звесткі пра якія ў нас маюцца. Перамяшчэнне экспазіцыйных плошчаў толькі ў адзін корпус палаца, хаця і прадугледжвае захаванне гістарычна складзенай планіроўкі і прыстасаванне пад сталовую і парадную гасцёўню (партрэтную залу) аналагічных памяшканняў, не можа не адбіцца і на рэканструкцыі інтэр'ера.

Праект музеефікацыі прадугледжвае стварэнне дзвюх залаў, якія самі па сабе будуць з'яўляцца экспанатамі. Гэта "сталовая ізба" (izba stołowa), якая будзе рэканструявана на час Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі (к. XVI ст. – 1616) і "партрэтная зала" перыяду барока.

Стварэнне двух стылістычных інтэр'ераў розных эпох прадугледжвае не проста аналіз крыніц, што захаваліся, але і пошук аналагаў дадзенага перыяду, якія могуць паслужыць падставай для рэканструкцыі інтэр'ера.

Адразу паўстае пытанне, што прымаць за ўзор і на якія помнікі арыентавацца. На наш погляд, мэтазгодна браць пад увагу ўнутранае аздабленне іншых радзівілаўскіх рэзідэнцый і каменных палацаў мясцовай шляхты. Арыентацыя на Вавель, які сапраўды служыў прыкладам для шматлікіх

рэплік у замкава-палацавым будаўніцтве Польшчы, будзе не зусім слушнай, бо такія прыклады на тэрыторыі Беларусі не зафіксаваны. Акрамя таго, трэба браць пад увагу, што Вавельскі палацавы ансамбль склаўся ў 1500–1518 гг., а Мірскі палацавы комплекс будаваўся амаль на 80–90 гадоў пазней. Несумнена, вытокі архітэктурных рашэнняў абодвух комплексаў ляжаць у Італіі. Але калі Вавельскі палац пабудаваны цалкам арцеллю італьянскіх майстроў – ад архітэктара да разьбяроў – і таму не ўтрымлівае рыс прыстасавання да мясцовых густаў і рэчаіснасці, то Мірскі будаваўся хутчэй пад уздзеяннем італьянскіх трактатаў па будаўніцтву[1].

Калі ўзяць за аснову меркаванне, што Мірскі і Нясвіжскі комплексы будаваліся прыкладна ў адзін час, то падобна на тое, што яны мелі і аднаго архітэктара. Знакаміты ліст Мікалая Крыштофа Радзівіла "Сіроткі" ад 19 красавіка 1594 г. на аплату працы Марціна Забароўскага за будаўніцтва Мірскага і Нясвіжскага замкаў можа часткова вырашыць праблему пошуку такога майстра[2]. Аналіз рахункаў Мікалая Крыштофа Радзівіла паказаў, што ўжо ў жніўні 1587 г. М. Забароўскі знаходзіўся на службе ў Мікалая Крыштофа Радзівіла і працаваў над узвядзеннем правага корпуса Нясвіжскага замка[3], а яшчэ на некалькі гадоў раней набыў дом для своёй сям'і ў Міры. Такім чынам, малюнак з т.зв. "Альбома Бернардоні" (Кіеў), які ўтрымлівае план будынкаў Нясвіжскага замка з іх памерамі, хутчэй за ўсё належаў менавіта мясцовым майстрам і быў зроблены па італьянскіх узорах. Падставай для выкарыстання італьянскіх матываў сталі кнігі "przynależącze do budowania forticzę", выпісаныя Сіроткам з Італіі і дастаўленыя слугой італьянцам 1 кастрычніка 1588 г[4].

[1]Kozakiewiczowie H. i S. Renessans w Polsce. Warszawa, 1976. S. 32.
[2]НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 4466. Арк. 363.
[3]НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 10723. Арк. 67.
[4]НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 10723. Арк. 65.

Такім чынам, архітэктура палацавых комплексаў на беларускіх землях несумненна знаходзілася пад уздзеяннем італьянскай моды, якая ўплывала на мясцовыя будаўнічыя традыцыі, але не выцясняла іх. Зыходзячы з гэтага, падаецца не мэтазгодным арыентавацца на Вавельскі замак як ўзор для вонкавага і ўнутранага аздаблення Мірскага замка. Не трэба забываць тут і ідэалагічны матыў. Радзівілы заўжды выступалі як прыхільнікі захаванасці самастойнасці ВКЛ і падкрэслівалі сваю адметнасць ад палякаў не толькі этнічным паходжаннем. І таму наўрад ці яны б сталі капіраваць палац польскіх каралёў, які быў адным з сімвалаў Польшчы.

Інвентароў XVI – першай паловы XVII ст. з апісаннем унутранага інтэр'ера, ці рэчаў з Мірскага замка не знойдзены. Сам будынак не дазваляе зрабіць рэканструкцыю на падставе рэшткаў арыгінальнага інтэр'ера, паколькі палац неаднаразова капітальна рамантаваўся ў сярэдзіне і ў канцы XVII ст., і пазней – у XVIII і XIX ст. На 1660 г. амаль цалкам былі разбураны перакрыцці і падлога верхніх памяшканняў, палац не меў вокан, дзвярэй і патрабаваў рамонту. Падрабязны інвентар 1688 г., складзены менавіта для аднаўлення палаца, паказвае, што рамонтныя работы фактычна былі звязаны з неабходнасцю ўладкавання палаца і яго прыстасавання для жылля.

Для рэканструкцыі пакояў Мірскага замка можна выкарыстоўваць як прыклад арганізацыю пакояў іншых шляхецкіх і магнацкіх рэзідэнцый у вызначаны час. Асноўную ўвагу неабходна скіраваць на палацы і маёнткавыя дамы як самога Мікалая Радзівіла Сіроткі, так і яго родных з біржайскай галіны. Пры аналізе інтэр'ераў апошніх будзе неабходна ўлічваць розніцу ў веравызнанні і змены мастацкіх і прапагандыскіх арыенціраў, якія часта адбіваліся на напаўненні жылых пакояў творамі мастацтва.

Трэба таксама ўлічваць, што Мірскі замак не з'яўляўся парадней рэзідэнцыяй роду, а выкарастоўваўся з часоў Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі як адзін з жылых палацаў разам з такімі, як палацы ў Белай, Чарнаўчыцах, Клецку. З гэтага вынікае, што раскошы ў афармленні інтэр'ераў, выдзялення асобных рэпрезентацыйных памяшканняў, такіх як партрэтныя, парадныя, бальныя залы, не было. Гэта ж пацвярджае і аналіз рахункаў кн. М.К. Радзівіла. Будаўнічыя работы ў перыяд к. XVI – пач. XVII ст. у Мірскім замку не вяліся і асобна прадметы раскошы для Міра не закупляліся.

Такім чынам, спроба рэканструкцыі "сталовай ізбы" Мірскага замка будзе ажыццяўляцца на падставе апісання пакояў з Інвентара 1688 г., а таксама па звестках з рахункаў Мікалая Радзівіла Сіроткі за 1600, 1609 г., інвентароў шляхецкіх двароў 1580–1630 гг. і рахункаў Мірскага графства за 1681–1700 гг.

**"Сталовая ізба"**

Паспрабуем прааналізаваць асноўныя мастацкія акцэнты, якія прысутнічалі ў інтэр'еры "сталовых ізбаў", мэблі, а таксама пакрыцці сцен і падлогі па парадку. "Сталовая ізба" пачынае вылучацца сярод памяшканняў дастаткова рана і заўжды размяшчаецца на верхніх паверхах, у адрозненні ад італьянскай традыцыі. Сама назва сустракаецца ўжо ў інвентарах з сяр. XVI ст. Менавіта "сталовая ізба" выконвала асноўныя рэпрезентацыйныя функцыі. Там знаходзіліся найбольш багата ўпрыгожаныя кафляныя печы, што падкрэслівала значнасць памяшкання.

**I. Печы**

Інвентары к. XVI – VII ст. сведчаць, што пакоі як парадныя, так і жылыя і гаспадарчыя ацяпляліся з дапамогай кафляных печаў. Печы (не больш адной) знаходзіліся ва ўсіх жылых памяшканнях ("ізбах", святліцах, пакоях). Зрэдку можна

сустрэць успамін пра знаходжанне печы ў каморы (калі яна выкарыстоўвалася як спальня) і ў сенях, якія злучалі некалькі вялікіх памяшканняў – "ізб". Сустракаліся канструкцыі, што спалучалі побач на адной сцяне печ і камін. Інвентар 1688 г. такога спалучэння не зафіксаваў, магчыма, што ў Мірскім замку яго ў больш ранні перыяд і не было. На карысць гэтай думкі сведчаць і раннія інвентары 1626, 1650 гг. Нясвіжскага замка, дзе таксама ў пакоях стаялі толькі печы[5].

Кафля гэтага перыяду часцей за ўсё была белая ці зялёная, што падкрэслівала асноўныя колеры афармлення памяшкання – белыя тынкаваныя сцены і зялёнае сукно, каберцы, абрусы. Кафля іншых колераў (кававая, бела-блакітная) стала сустракацца ў больш позні перыяд. Коміны тынкаваліся і бяліліся. (іл.1)

Возьмем за прыклад інвентары Кронскага маёнтка Кішак



*Іл. 1. Сямейныя будні. Невядомы майстар. Гравюра. 1510.*

[5]AGAD. AR. Dz. XXVI. № 36.; AGAD. AR. Dz. XXVI. № 86.

1594 г. і клецкай і нясвіжскай рэзідэнцый Радзівілаў у 1626 г., якія былі пабудаваны з цэглы. Знарок не бярэм пад увагу драўляныя будынкі, бо там сам матэрыял даваў магчымасць наогул не ставіць печаў у парадных залах.

Інвентар Клецкага замка, які да пабудовы Нясвіжскага комплексу з'яўляўся цэнтральнай рэзідэнцыяй гэтай галіны роду, на момант апісання прыходзіў у заняпад, вокны былі выбітыя, дах месцамі пагніў. Таму можам аднесці яго інтэр'ер менавіта да абранага перыяду рэканструкцыі памяшкання. "Сталовая ізба", як і ў большасці палацаў, была на 8 акон, што сведчыць пра наяўнасць пэўных стандартаў для такіх памяшканняў. У Клецку:"Izba stołowa […] W tey Izbie Okien osm z błonami szklanemi Calemi i z okiennicami dwoistemi na zawiasach. Piec kachli malowanych, kominek murowny"[6]. Трэба адзначыць, што на 15 жылых памяшканняў Клецкага палаца было толькі 4 печы, хаця падлога па ўсім доме была цагляная ("Ten wszytek dom pawiment posadzką Ceglaną położony"[7]), і ў пакоях павінна было быць дастаткова халодна.

У Кронях: "okien 9 błony szklane s tey izby do moska w drzwiczko z dworu i ganku zamek wnetrzny. Piecy poliwanej zielonej"[8]. У Заблудаве: "do stolowey izby […]W izbie okien osm w nich kwater w olow oprawne trzydziesci dwie u ktorych kwater prętow zelaznych trzydziesci dwa kolec trzydziesci iedno, zakrętek trzydziesci dwie[…]. W tey ze izbie zielonych kafli poliwanych piec około niego s poręczem wkoło balasy tokarskiey roboty przy tym poręczu drzwi cikimole zelaznych"[9]. Мы бачым, што печ у "сталовай ізбе" як у Мірскім[10], так і ў Клецкім замках вызначалася багатай аздобай і паліхроміяй, што пацвяр-

[6] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 3135. Арк. 2.
[7] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 3135. Арк. 3.
[8] НМГіК. КП – 44686/19. Арк. 3.
[9] НГАБ.Ф. 694. Воп 2. Спр. 2635. Арк. 2.
[10] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 4468. Арк. 18 адв.

джаюць інвентары і археалагічныя знаходкі гербавай кафлі ў Міры.

Вызначыць дакладна памеры печы і яе месцазнаходжанне ў канкрэтным памяшканні не з'яўляецца магчымым, бо "сталовая ізба" ў Міры, як вынікае з інвентара 1688 г., знаходзілася на другім паверсе і ў іншым корпусе. Непасрэдна пад ёй знаходзіўся склеп, дзе захоўваліся харчовыя прадукты, мэбля і гаспадарчыя прылады. Адсуль вынікае, што печы ў жылых памяшканнях Мірскага замка ставіліся на падлогу, а не фундамент, як у адна-двухпавярховых шляхецкіх сядзібах. У інвентарах наогул размяшчэнне печаў не фіксуецца, і тут інфармацыю нам могуць падаць толькі натурныя даследаванні размяшчэння дымаходаў (калі сцены не перакладаліся).

Да 30-х гг. XVII ст. печы маглі ставіцца ў міжаконныя прасценкі, а дымаход выводзіўся на дах. Ускосна гэта пацвярджаюць і запісы ў інвентарах, дзе адзначаецца, што печ стаіць пасяродку. З 20–30-х гг. XVII ст. сценкі печаў становяцца ўсё танчэйшыя, яны змяшчаюцца ў куты, да міжпакаёвых сцен, спалучаюцца з комінамі[11].

Прапанаваны да рэканструкцыі Д.С. Бубноўскім, навуковым кіраўніком па рэканструкцыі замка, двухкамерны тып печы з круглым верхам абапіраецца на заходнееўрапейскія аналагі і рэканструкцыі польскіх гісторыкаў і археолагаў. Але, па сцвярджэнню польскай даследчыцы М. Данброўскай, такі тып печаў – цалкам ці часткова круглых – быў распаўсюджаны на працягу XV – 80-х гг. XVI ст. У пазнейшы перыяд яны саступаюць месца двухкамерным печам з квадратам ці чатырохкутнікам у аснове і квадратнай верхняй камерай[12]. (іл.2.) Менавіта такі тып канструкцыі печаў і быў рэканстуяваны археолагамі А. Трусавым, Ю. Зайцам, Д.

[11] Dąbrowska M. Kafle i piece kaflowe w Polsce do końca XVIII wieku. Wroclaw, 1987. S. 146.
[12] Dąbrowska M. Kafle i piece kaflowe w Polsce do końca XVIII wieku. S. 163.



*Іл. 2. Дворскія забавы. Себасцьян Брант. (Sebastian Brant). 1508*

Дукам на падставе сваіх даследаванняў. Прывязка да 1594 г. адразу адхіляе магчымасць існавання ў Мірскім замку печаў вавельскага тыпу першай паловы XVI ст., прапанаваных Д.С. Бубноўскім.

Па падліках М. Дамброўскай, адна вялікая печ ставілася ў памяшканнях, якія мелі да 40 м$^2$. Печы XVI–XVII стст. адзначаліся ў пазнейшых архітэктурных трактатах як вялікія з тоўстымі сценкамі, прызначаныя трымаць цяпло 24 гадзіны[13]. Нам падаецца мэтазгодным прытрымлівацца менавіта такога прынцыпу арганізацыі жыллёвай прасторы, тым больш што рэканструкцыя "сталовай ізбы" праводзіца не ў арыгінальным памяшканні.

**II. Вокны і дзверы**

Апісанне вокнаў і дзвярэй разам з печамі было характэрнай асаблівасцю кожнага інвентара. Складальнікі гэтых дакументаў дакладна вызначалі не проста колькасць вокнаў ці дзвярэй, але і асаблівасці іх канструкцыі, матэрыял з яко-

[13] Switkowski S.. Budowanie wiejskie. 1793.

го яны былі выраблены. Не будзем тут падрабязна спыняцца на характарыстыцы акон, пазначым, што звычайна рамы былі зроблены са свінца ці дрэва і абараняліся ад непагоды акенніцамі ці жалезнымі прутамі. Яны выконвалі функцыі заслон ад ветра ці святла, тады як парц'еры ці фіранкі ў згаданы перыяд не выкарыстоўваліся ў парадных памяшканнях. (іл.3.)



*Іл. 3. Вячаровы банкет. Вольфганг Хаймбах (Wolfgang Heimbach), 1640.*

Для аздаблення памяшкання маглі выкарыстоўвацца пафарбаваныя дзверы і маляваныя ліштвы (драўляныя планкі). У Койданаве "izba wielka stołowa malowana, do niey drzwi niemieckiey roboty sadzenym drzewem malowane, na troich zawiasach pobielanych z zamkiem wnętrznym pobielanym y ze dwema antabami"[14]. У Шаўлях у 1619 г. да "сталовай ізбы" вялі "drzwy malowane stoliarskiej roboty s lisztwami wkoło, podwoiow malowanemi na zawiasach pobielanych z zamkiem

[14] НГАБ.Ф. 694. Воп 2. Спр. 2635. Арк. 2.

wnętrznym y z antabą". Пры тым, што такім чынам былі аздоблены дзверы да ўсіх парадных пакояў[15]. Інвентар Смаргоні адзначаў дзверы і ўшакі, пафарбаваныя слаямі.

## III. Сцены

Сцены ў замках часта бяліліся і маглі аздабляцца фрэскаваым жывапісам з раслінным, ваенным ці міфалагічным сюжэтам. Гэта быў адгалосак яшчэ ранейшай традыцыі пачатку XVI ст. На іх маглі наносіць як арнамент ў выглядзе фрыза, так і цалкам размалёўваць сцены. Часцей за ўсё за аснову браўся расліны арнамент, у які "упляталіся" гратэскавыя элементы (маскі, выявы жывёл і людзей). Такое ўбранне захоўвалася не толькі ў магнацкіх рэзідэнцыях (падобна, што і нясвіжская "сталовая ізба" мела пабеленыя сцены), але і ў каралеўскіх палацах (Гародня). (іл.4.)



*Іл. 4. Гратэскавы арнамент. Застаўка з віцебскага прывілея. 1597 г.*

Сцены ў "сталовых ізбах" аздабляліся звычайна ў адным стылі – з дапамогай тэматычных збораў твораў жывапісу (асобна батальныя сцэны, партрэты). З 10–20-х гг. XVII ст. сцены пачалі дэкарыравацца самымі рознымі матэрыяламі: ад скуры і дрэва да тканін розных гатункаў. Тканіны (апоны,

---

[15] Instrukcijos feodalius valdu administracijai Lietuvoje XVI–XIX a. Vilnius, 1985. S. 82–83.

абіцці) рознага гатунку (сукно, палатно, кітайка, адамашак) пераважна былі ў зялёных ці чырвоных тонах. Для Радзівілаў – пратэстантаў біржайскай галіны – становіцца традыцыйным выкарыстанне ва ўбранні сцен галандскіх тканін, а магчыма, і габеленаў. У віленскім палацы яны мелі нават дзве "сталовыя ізбы", мастацкае аздабленне якіх адрознівалася: "W wielkiej kamienice Izba stolowa obita wsystka oponami ynderlanskimi ktorych sztuk 12, Falendyrz czerwony miedzy oknami, Obrazow roznych konterfowanych 20, Lichtarz wielki mosiądzowy do zawieszenia, Pozytyw muzyczny do grania"[16] у каменнай пабудове, і ў драўлянай: "W domu drewnianym w stolowej izbie obrazow roznych woiennych 18. Obraz bitwy na Kropiwnej, Konterfet Xcia JM po husarsku, Konterfet Xżny J M Lichtarz mosiądzwy zawiesisty"[17]. Так, Януш Радзівіл замовіў нават "апоны нідэрландскія з гербам […] на пакрыццё столкаў", якія ў 1620 г. дасталіся яго сыну Багуславу[18].

Мы ўжо казалі пра магчымую стандартнасць "сталовых ізбаў" для розных маёнткаў, што пацвярджае і колькасць апон. Звычайна яна складае 12 штук і не мяняецца на працягу XVII–XVIII стст., гэта можа сведчыць і пра адсутнасць архітэктурных змяненняў у шляхецкіх рэзідэнцыях.

Міжаконная прастора магла аздабляцца тканінай іншага гатунку і колеру: Ta yzba zaponami obita, ktorych opon wkoło trzynascie a pod oknami przybitych kobiercow siedm, nad oponami kortyn malowanych co w ramach dziesięc. A wyzszey nad tymi takze wiasich obrazow cztyry, a na de drzwiami w ramach wielka kortyna (Койданава)[19]. Габелены (аррасы), моду на якую распаўсюдзіў вялікі князь Жыгімонт Аўгуст, меліся і ў зборах Радзівілаў. Але на пачатак XVII ст. вядома іх толькі

[16] AGAD. AR. Dz. XXVI. №37. S. 47.
[17] AGAD. AR. Dz. XXVI. №37. S. 49.
[18] AGAD. AR. Dz. XXVI. № 25. S.1.
[19] НГАБ. КМФ-5. Воп. 1. Спр. 1697. Арк. 3.

два, якія належалі нясвіжскай галіне. Гэта былі замоўленыя Мікалаем Радзівілам Чорным на рэлігійную пратэстанцкую тэматыку творы[20], і хутчэй за ўсе яго сынам, які стаў каталіком, для аздобы памяшканняў яны не выкарыстоўваліся.

"Сталовая ізба" часта мела драўляны ганак (ці невялікую галерэю), які звычайна выкарыстоўваўся для выступленняў музыкантаў. У інвентары 1688 г. адзначана: "Ganek z wschodkami dla muzykantow nowo zrobiony bez balias". Хутчэй за ўсё гэта значыць, што ён быў перароблены і ад тачоных баляс было вырашана адыйсці з-за змяненняў моды. Вось як выглядалі аналагічныя ганкі ў іншых палацах: "… ganek malowany dla muzyki ziestasz srzod izby rogom (...) osobliwe stolek i ławka na ganeczku dla muzyk"[21]. "Над дверью балкон с балясами на двух столбах"[22]. Акрамя саміх музыкантаў (якія звычайна гралі на скрыпцы, лютні, ражках), у "сталовых ізбах" знаходзіліся і клавішныя музычныя інструменты "Instrument pozlocisty w olstrze czarnym, pozytyw cały[23], clawicord". Ёсць звесткі, што і ў Міры з 70 гг. XVII ст. дакладна знаходзіліся музычныя інструменты: клавікорд і спінет, папулярны менавіта ў другой палове XVI ст.[24] Знаходзіліся яны і сярод пазнейшых рэчаў у XVIII ст. "скрыпіца басовая, інструмент вялікі, лютня з футлярам"[25].

### IV. Столь

Столь на верхніх паверхах, як сведчаць нават больш познія інвентары, мацавалася на драўляных балках, якія

---

[20] Хадыка А.Ю. Непаўторныя рысы: з гісторыі беларускага партрэта. Мн., 1992. С. 73.

[21] НМГіК. КП - 44686/19. Арк. 3.

[22] Инвентари магнатских владений Белоруссии XVI–XVIII вв. Владение Сморгонь. / Гл. арх. упр. при СМ БССР Центр. гос. ист. архив БССР в г. Минске, Ин-т истории АН БССР; [Сост. д-р ист. наук П.Г. Козловский и др.; Предисл. д-ра ист. наук П.Г. Козловского]. Мн., 1977. С. 27.

[23] мабільны арган

[24] НГАБ.Ф. 694. Воп 2. Спр. 10728. Арк.79.

[25] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 53. Арк. 363.

потым абмуроўваліся, а сама столь падшывалася дрэвам[26]. Дрэва пакідалася ці натуральнага колеру ці размалёўвалася: "Весь потолок расписан разными красками. На нем 4 позолоченные таблицы, гравированные на еврейский манер"[27]. Размаляваныя столі зафіксаваны інвентаром ад 1650 г. у Нясвіжы. (іл.5.) Падобна на тое, што размалёўка столяў з выкарыстаннем гербавай сімволікі была характэрна для цэнтральных рэзідэнцый шляхецкіх родаў. У тым жа Нясвіжы былі памаляваны як столь цалкам, так і толькі ліштвы да балак[28].


Malowany strop domu krakowskiego (ul. Św. Anny 11)

*Іл. 5. Размаляваныя стропы ў доме заможнага мешчаніна. Кракаў. XVI ст.*

На столь мацавалі падвясныя на ланцугах круглыя ліхтары ці ліхтары са свечамі на некалькі рагоў: "…посреди комнаты 2 позолоченных подсвечника. Один подсвечник с оленьими рогами, а сверху голова Мелюзины, с двумя медными трубками для свечей. Второй подсвечник с лосиными рогами и головою дракона наверху, с двумя трубками для свечей. Эти оба подсвечника подвешены на побеленных (луджо-

---

[27] Инвентари магнатских владений Белоруссии XVI–XVIII вв. Владение Сморгонь. С. 27.
[28] AGAD. AR. Dz. XXVI. № 86. S. 18–22.

ных– Аўт.) цепях”[29].

Выкарыстанне звярынай паляўнічай сімволікі было, падобна, папулярным на той час, бо інвентары “сталовых ізбаў” фіксуюць пераважна такія ліхтары: “Lichtarz drzwiany wisi srzod izby”[30]; “W tey yzbie na posrodku u balki glowa ielenie nogi, na lancuchach pobielanych zawieszona o pięciu lichtarzach dla swiec”[31]; Lichtarz na łancuchu z głową Jelenia[32]. Падобныя ліхтары выкарыстоўваліся і ў Мірскім замку, але ў сярэдзіне XVII ст. яны былі знятыя і схаваны ў скарбцы, адкуль потым і былі скрадзены[33]. (іл.6.)



*Іл. 6.Паляўнічая зала. Боўзаў. Чэхія. II палова XVI ст.*

Шырока прымяняліся і ліхтары з розных матэрыялаў – срэбра, латуні, бляшаныя для насценнага і настольнага асвятлення. Вельмі часта яны былі парныя і ўпрыгожваліся ро-

[29] Инвентари магнатских владений Белоруссии XVI–XVIII вв. Владение Сморгонь. С. 27.
[30] НМГіК. КП – 44686/19. Арк. 3.
[31] НГАБ. КМФ-5. Воп. 1. Спр. 1697. Арк. 3.
[32] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 3135. Арк. 2.
[33] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 4466. Арк. 29–31.

давым гербам.

## V. Падлога

На першым, а зрэдку і другім паверхах у каменных палацах, ці палацах на высокім падмурку падлога выкладалася з цэглы. Так было ў Кобрыне, Клецку, Шаўлях і Міры. Дзе-нідзе, асабліва з пачатку XVII ст. сустракаецца падлога з каляровых плітак "posadzka".(іл.7.) Часцей за ўсё падлога рабілася з драўляных дошак. Інвентары адзначаюць "wszystka deskami wymoszczona", "tarcicami polozona", "pawiment", "пол дощатый".



*Іл. 7. Цагляная падлога "павімент". Бернардынскі касцёл. Вільнюс. XVI – XVII ст.*

## VI. Мэбля

У самой зале магло знаходзіцца да васьмі сталоў (вялікіх, сталярскай работы), лавы і лаўкі, шафа (служба, крэдэнс) для посуду.

У кожнай "сталовай ізбе" стаяла ад аднаго да сямі вялікіх сталоў ці адзін вялікі і некалькі малых. Звычайная агульная лічба была 1–3, але дзе-нідзе адзначалася нават 14 сталоў. Што ж разумелася пад вялікімі сталамі? Л. Галенбіёўскі ў сваёй кнізе называе іх даўжыню 6–7 метраў[34]. Гэта верагодна, бо калі мы паглядзім расход палатна на абрус для вялікага стала, то ён складаў 9,5–10,5 локцяў[35] (каля 6,5–7,5 метраў). Такім чынам, вялікі стол сталярскай работы меў наступны выгляд: даўжыня каля 6,5–7 метраў на чатырох, радзей шасці ножках. Верх рабіўся з некалькіх дошак, звычайна з дуба ці ліпы. Іх

[34] Gołębiowski Ł. Domy i dwory... Warszawa. 1830. S. 21.
[35] Локаць = 64,98 см

знешні выгляд мы можам убачыць на партрэтах і абразах таго часу. Сталы стаялі каля сцяны і былі пакрытыя каберцамі. Падчас абедаў ці банкетаў яны высоўваліся на сярэдзіну залы і пакрываліся белымі накрухмаленымі абрусамі. Пад ніз белых абрусаў клалі некалькі каляровых ці каберац.

Уздоўж сцен стаялі лавы сталярскай работы, якія маглі быць з поручамі і часам пафарбаваны. Звычайна іх было не менш трох. Інвентар Мірскага замка 1688 г. паказвае, што на той момант у "сталовай ізбе" знаходзілася 1 стол і 5 лаў[36]. Падобна, што стаялі яны ўздоўж 2 сцен. З іншай мэблі маглі там знаходіцца і табурэцікі і драўляныя крэслы (для гаспадара, шаноўнага госця). Крэсел, абітых скурай ці сукном, звычайна было два ці тры. У 1609 г. у Вільні Сіротка замовіў чырвоны кір, каб аббіць сталы і лавы ў "сталовай ізбе"[37].

Посуд захоўваўся ў спецыяльных шафах-буфетах (крэдэнсах). У Міры яшчэ пры будаўніцтве такі крэдэнс быў закладзены ў муры. (іл.8) Гэта сведчыць, што выдзяленне менавіта сталовай "ізбы" рабілася яшчэ на стадыі будаўніцтва, а не афармлення інтэр'ераў: "Sluzba w murze w niey dla srebra policzek pięc". У Заблудаве: "… służba s tarcic stoliarskiey roboty. W niey saf trzy. Czwarta safa spodnia w niey schowanie. Przed służbą poręcze s balasami tokarskiey roboty. Do tey słuzby wchodząc dwiczki małe na zawiasach"[38].



***Іл. 8. Мураваная ніша пад крэденс. Вавель. Кракаў. XVI ст.***

[36] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 4468. Арк. 18 адв.
[37] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 9779. Арк. 59.



*Іл. 9. Крэдэнс. 1570 г.*

Аналагічным чынам была арганізавана і ў Койданава: “W tey yzbie służba w niey stale piec biały malowany s kominem murowanym s kratą a za piecem zakrętą komorka dla kredencerza drzwi na zawiaskach prostych s proboiami y z zaszepkią”. Каля печы мог с таяць малы столік ці служба. На яго ставілі таз з жбанам для мыцця рук, ці выкарыстоўвалі як “Ganeczek do stawiania naczynia stolowego”. У Шаўлях таксама служба перад уваходам выкарыстоўвалася для напояў: “…w niey po prawey ręce wszedszy sluzba do nalewania picia malowana stoliarskiey roboty zamczysta, przy niey drzwi na zawiasach pobelanych z zamkiem wnętrznym z antabą; do piwnice nad tęn slużbą ganeczek do muzyky”. У Смаргоні арганізацыя крэдэнсу была падобная: “Буфет со столярной резьбою. В нем 6 дверец, 2 дверцы на побеленных петлях, 2 – на простых, а 2 дверцы – без петель. У буфета стол на побеленных петлях. Внутренний замок, 2 ящика с внутренними замками. Буфет огражден балясами”. (іл.9.)

Служба такая замыкалася ці кратамі ці ўнутраным зам-

[38] НГАБ.Ф. 694. Воп 2. Спр. 2635. Арк. 2.

ком і фарбаваліся ў чорны ці зялёны колеры[39]. Змяшчаліся яны ў куце "сталовай ізбы" за балясамі, уваход за якія быў забаронены ўсім акрамя крэдэнсара. Посуд там захоўвалі звычайна срэбраны.

Крэдэнсарам ў Сіроткі на той момант служыў італьянец, які і адказваў за срэбра і яго выдачу на банкеты[40]. Дарэчы, гэта была адказная пасада, на якую прызначаўся чалавек, што не ўжываў віна і гарэлкі і які быў павінен захоўваць цвярозы розум да канца імпрэзы. Захаванне срэбра, посуду, сталовых прыбораў ці ў асобным пакойчыку, ці ў пастаўленым асобна крэдэнсе, службе было выклікана знікненнем срэбранага посуду. Не мінула гэта і Мір. Падчас абеду, у прысутнасці князя, кудысьці знікла срэбраная паўміска[41]. Мэтам ахо-вы каштоўнасцей служыла і практыка нанясення на посуд родавага герба ўладальніка. Радзівілы клеймілі не толькі срэбраны, але і медны і алавяны посуд. У 1587–1592 гг. ва ўласнасці Мікалая Крыштофа Радзівіла знаходзілася некалькі такіх прадметаў мэблі. У спісе рэчаў яны фігуравалі пад назвамі "крэдэнс просты", "kredens krysztalem oprawny"[42].

Да стала падаваліся белыя сурветкі, відэльцы і ножыкі, некаторыя з якіх былі замоўлены па італьянскім ўзоры і змешчаны ў футляры[43]. Сталовы посуд быў як металічны, так і гліняны, паліваны, прывезены з Бялай. Пілі са срэбраных чарак, кубачкаў, раструханаў, а для членаў княжацкай фаміліі закуплялася нават венецыянскае шкло[44]. (іл.10.)

Такім чынам, "сталовая ізба" Мірскага замка эпохі Рэнесансу магла выглядаць наступным чынам: драўляныя

---

[38] НГАБ.Ф. 694. Воп 2. Спр. 2635. Арк. 2.

[39] Инвентари магнатских владений Белоруссии XVI–XVIII вв. Владение Сморгонь. С. 24.

[40] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 9779. Арк.11.

[41] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 53. Арк. 311.

[42] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 53. Арк. 311адв.

[43] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 4959. Арк. 59.

[44] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 1072. Арк. 211.



*Іл. 10. Застолле. Друкарня М. Віжбенты, 1550-я гг.*

падлога і столь з падвясным круглым ліхтаром пад свечы ў паляўнічым стылі. Па пабеленых сценах размяшчаліся карціны і віселі насценныя ліхтары. У залу вялі расфарбаваныя (ці з інкрустацыяй) дзверы на завесах з унутраным замком. У супрацьлеглым баку над дзвярыма ў вежу знаходзіўся драўляны ганак для музыкантаў. Поручні ганка і лесвіцы былі ўпрыгожаны балясамі. Паміж вокнамі стаяла адна вялікая (ці калі даказана наяўнасць дымаходаў – дзве) паліхромная печ з гербавай кафляй. Уздоўж сцен размяшчаліся вялікія сталы, лавы (магчыма, аббітыя сукном) сталярнай работы і два крэслы для гаспадара. Па сцяне направа ад уваходу можна размясціць службу для налівання напояў, а побач абнесены балясамі крэдэнс для посуду.

**Партрэтная зала перыяду барока**

Як вядома, адрамантаваны Мірскі замак у адноўленым выглядзе прастаяў вельмі нядоўга, і падобна на тое, што нават і не атрымаў завершанага інтэр'ернага аздаблення. Гэта магло быць звязана з некалькімі фактарамі. Па-першае, сам працэс будаўніча-рамонтных работ зацягнуўся на 3–4 гады і быў

скончаны не раней за 1691 г. Напаўненне жылых пакояў другога і трэцяга паверхаў палаца вымагала значных фінансавых сродкаў, якімі не валодалі Радзівілы на той час. У канцы стагоддзя яны аказаліся ўцягнутымі ў саперніцтва паміж магнацкімі групоўкамі, а потым фактычна ў грамадзянскую вайну, справакаваную партыяй Сапегаў. Падзеі Паўночнай вайны, якія закранулі тэрыторыю Беларусі, прывялі да захопу замка шведамі і пажару ў Мірскім замку. Падчас сваіх нападаў шведы вызначыліся, у тым ліку, і суцэльным разрабаваннем захопленай маёмасці, пры чым вывозіліся не толькі мастацкія прадметы, ці вырабы з каштоўных металаў, але і прадметы інтэр'еру, зброя і нават краты і жалеза, як гэта было з Койданавам.

Да аднаўлення Мірскага замка было вырашана прыступіць не раней за 1718 г., для чаго ўжо 1 студзеня 1719 г. і быў складзены інвентар Мірскага замка, які зафіксаваў стан захаванасці будынку і акрэсліў памер рамотных работ[45]. Найбольшую цікавасць прадстаўляюць звесткі пра колькасць прамых дымаходаў, якія выводзіліся на дах і меліся па ўсіх жылых памяшканнях верхніх паверхаў: "Na tych pokoiach kominow nowo reparowanych na dach wywiedzionych trzynaście, a dwa kominy wielkie po Sztabie żelaza dla beśpieczności są przybite. Te pokoie wszystkie owo zgoła od Spalenia Szwedzkiego są poriunowane y puste. Drzwi żadnych ani żelaza niemasz co uszakach, okna także żadnego niemasz. Na wierchu tylko pod dachem circumarcą nowo pomurowane y otynkowane"[46]. Такім чынам, уладальнікі маглі прыступаць да стварэння цалкам новага інтэр'ера, а не прыстасоўваць старыя памяшканні да новых патрабаванняў. У гэты час часткова мяняецца не толькі сама архітэктура пакояў, але і іх прыз-

[45] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 4469. Арк. 607- 612.
[46] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 4469. Арк. 607 адв.

начэнне, з'яўляюцца функцыянальныя пакоі, якія раней не меліся ў палацы.

Апісанне 1720 г.[47] паказвае, што за год будаўнікі паспелі ўставіць вокны і дзверы з замкамі ў пакоях і на гэтым спыніліся. На жаль, інвентары замка, якія б характарызавалі жылыя і парадныя памяшканні, не захаваліся. Існуе інвентар 1774 г., які адзначае аздабленне парадных пакояў ляпнінай ("гіпсатурай") у французскім стылі з ужываннем пазалоты. Паўстае пытанне, на які час праводзіць рэканструкцыю памяшкання, вядомага як "Партрэтная зала" – пачатковага аднаўлення, якое хутчэй за ўсё праводзілася прыдворным архітэктарам нясвіжскіх Радзівілаў К. Ждановічам (які да 1724 г. кіраваў перабудовай нясвіжскага замка) ці спыніцца на захаваным інвентары.

Як сцвярджае В.В. Калнін, канчатковае афармленне інтэр'ераў замка адбылося пасля 1738 г., пра што сведчыць запіс у дзённіку Міхала Казіміра Рыбанькі. Аналіз гістарычнай эпохі і барацьбы стыляў, якая атрымала назву "барацьбы фрака з жупаном", дазваляе сцвярджаць, што арыентацыя ў афармленні жылых інтэр'ераў у сярэдзіне XVIII ст. была скіравана на Францыю. Гэта было звязана як з палітычнымі ўплывамі, так і з панаваннем французскай моды. Інвентар 1778 г. падае нам стан пакояў, якія ўжо разбураюцца, і таму мы можам сябе ўяўвіць, як яны маглі выглядаць у сярэдзіне XVIII ст. Пра выкарыстанне ракальных матываў у ляпніне, дробнай пластыцы сведчаць і праекты парталаў, люстраў, якія ствараліся для Радзівілаў[48].

У партрэтнай зале знаходзілася печ, а не камін, абкладзеная кававай кафляй з пазалотай. Печы таго часу былі невялікага памеру, стаялі каля міжпакаёвых сцен, часта

---

[47] AGAD. AR. Dz. XX. S. 2428.

[48] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 10727. арк. 27, 67, 67 адв., 99, 402 адв., 435, 458 адв.

ў нішах. Фундаменты пад печы часта не будавалася, яны мацаваліся на 6 ножках з featureнага матэрыялу ад дрэва да мармура[49].

Кававая кафля сведчыць пра тое, што аздоба сцен таксама была прыглушаных тонаў, хутчэй за ўсё з выкарыстаннем зялёнай, кавава-бежавай, цялеснай ці традыцыйна пунцовай, пурпурнай з золатам (жоўтай) гамы. Сцены былі пакрыты тканымі шпалерамі. Як сведчаць спісы радзівілаўскай маёмасці тых часоў, апоны для сцен часцей за ўсё былі паплінавыя, адамашкавыя ці атласныя аднатонныя, ці двухкаляровыя (звычайна спалучаліся чырвоны з жоўта-залацістым і зялёны з залацістым). З сярэдзіны XVIII ст. гама становіцца вельмі шырокай – ад цялеснага і ружовага да аранжавага і цёмна-сіняга з тканымі аплікацыямі і вышыўкамі на кітайскі манер. Дакладна вядома толькі пра некалькі абіццяў: “Obicia grabrynowego w Mirie ieden karmazynowy a dwa zlotych”[50], і зялёнае адамашкавае.

У партрэтную залу з прадпакоя вялі падвоенныя дубовыя акаваныя дзверы філянговай работы на французскіх завесах з унутраным замком з засоўкамі ўверсе і ўнізе.

На падлозе ў партрэтнай зале ляжаў дубовы паркет у квадрат (“паркет дубовы малы”). Па краю столі-плафона ішла алябастравая ляпніна, падобная на ракальны тып, багата пакрытая пазалотай. Наяўнасць аналагічнай пазалоты па сценах, дзвярах і аконных адхонах у інвентары не пазначана, але натурныя даследаванні Д.С. Бубноўскага выявілі рэшткі ляпніны на аконных адхонах. Функцыю параднасці залы выконвалі пазалочаныя багеты і мэбля. Мастацкае вырашэнне залы тых часоў было выканана ў аднолькавых тонах, і звычайна з адной тканіны рабілася і абіцце сцен і парцье-

[49] НГАБ. Ф. 694. Воп. Спр. 53. Арк. 7 адв.
[50] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 51. Арк. 19.

ры. Парцьеры былі таксама аздоблены залацістымі брэтамі, шнурамі ці вышыўкай. На вокнах парадных залаў вешаліся і тонкія фіранкі з мусліну, звычайна белага колеру[51].

На падлогу маглі класціся дываны ці кілімы, выраб якіх быў арганізаваны ў Карэлічах. Прыклады такіх кілімаў з "французскім" узорам часоў Людовіка XIV зараз захоўваецца ў музеі Альберта і Вікторыі ў Лондане, а другі – у Парыжы.

Як вядома, у гэты перыяд шырока выкарыстоўвалі для аздобы залаў шкло і люстры. Аналіз аналагічных інвентароў радзівілаўскіх маёнткаў паказвае, што люстры, шкло для вокан і свяцільнікі браліся з Урэчскай мануфактуры[52]. Таму для партрэтнай залы прапануецца зрабіць 4 копіі жырандоляў з аналагаў, якія захаваліся (гл. Дадатак да гістарычнай запіскі В.В. Калніна. Т. 3).

Аналіз інвентара паказвае, што партрэтная зала выступала ў комплексе з іншымі рэпрезентацыйнымі памяшканнямі – сталовай ізбы. Сведчаннем таго, што сродкі былі ўкладзены толькі ў некалькі рэпрэзентацыйных пакояў, стаў інвентар, які фіксуе наяўнасць элементаў французскага стылю з пазалотай толькі ў некалькіх памяшканнях, парадных. Жылыя пакоі адзначаліся значна большай сціпласцю, вялізныя залы былі падзелены на невялікія пакоі, у якіх былі пастаўленыя новыя печы і каміны для лепшага ацяплення.

Госці траплялі ў парадную частку палаца па лесвіцы праз пакой, таксама афармлены ў французскім стылі. Зыходзячы з традыцый таго часу, менавіта ў партрэтнай зале адбываўся іх першапачатковы прыём, тут жа маглі быць размешчаны невялікія сталы (на 4–6 чалавек) для гульні ў карты і мэбля для адпачынку (канапы, крэслы). Насычанасць мэбляй партрэтнай залы ў параўнанні са "сталовай ізбой" рэнесанснага

[51] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 51. Арк. 18 адв.
[52] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 51. Арк. 354.

тыпу адрознівалася большай напаўняльнасцю і колькасцю дэталяў. Пад асноўным творам (вялікім патрэтам у цяжкой раме, габеленам) звычайна ставілі гарнітур – стол, канапы і два крэслы. Абіўка мэблі магла быць габеленавай ці зробленай з тканіны, каларыстыка якой спалучалася з абіццем сцен.

Такім чынам, для афармлення партрэтнай залы неабходна будзе арыентавацца на перапрацаваныя ў польскай традыцыі французскія ўзоры інтэр'ера парадных залаў: упрыгожаныя пазалочанай ляпнінай столь і аконныя адхоны, спалучэнне паркету і невялікіх драўляных панеляў на падлозе і разнога аздаблення столі, зацягнутыя тканінай пурпурнага колеру з жоўтым (залатым), чатыры хрустальныя жырандолі і насценныя свяцільнікі, меблявыя гарнітуры.